**Ірына Колабава** *(Мінск)*

# ПРЫБЫТКОВА-ВЫДАТКОВЫЯ КНІГІ МАГІЛЁЎСКАГА МАГІСТРАТА ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ ГАНДЛЮ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVII–XVIII ст.

Тэрыторыя Усходняй Беларусі, што знаходзілася ў непасрэднай блізкасці да Расіі, з'яўлялася своеасаблівай кантактнай зонай, дзе ў другой палове XVII – XVIII ст. склаліся спецыфічныя стабільна-лакальныя асаблівасці грашовай гаспадаркі.

Вывучэнне манетнага фонду і рэальнага кошту грашовых адзінак усходнебеларускага рынку гэтага часу дазваляе значна пашырыць агульную карціну эканамічнага стану Беларусі.

Разглядаемы перыяд багаты не толькі матэрыяльнымі рэліктамі грашовага абарачэння, але і разнастайнымі пісьмовымі крыніцамі, якія запаўняюць тыя лакуны, што непазбежна застаюцца пры нават самым руплівым вывучэнні скарбавага матэрыялу. Дакументы ствараюць магчымасць даследаваць найбольш значныя аспекты грашовай гаспадаркі, напрыклад складасці кола грашовых адзінак, што былі ў абарачэнні, вызначыць іх рэальныя рынкавыя курсы і пакупніцкую здольнасць, эвалюцыю рынкавых коштаў, мясцовую грашовую тэрміналогію, што была народжана ўзаемаўплывам польскай, літоўскай, заходнееўрапейскай і расійскай лексік і, нарэшце, адсачыць праяўленне такіх функцый грошай, як мера вартасці, сродак абарачэння, плацяжу, назапашвання, сусветныя грошы.

З другой паловы XVII ст. грашовая гаспадарка, якая грунтавалася на значнай колькасці нізкапробнай манеты і параўнальна невялікім аб'ёме срэбных і залатых манет, усё часцей адыходзіць ад традыцыйных норм рынкавага абарачэння і ліку. Назіраюцца рэзкія ваганні курсаў асноўных наміналаў і, як наступства гэтага, коштавых суадносін паміж імі. Манеты заходнееўрапейскіх краін даволі часта абарачаліся на рынках Беларусі пад тымі ж назвамі, што і іх польскія і літоўскія аналагі. Гэта «маскіроўка» часам не толькі вельмі абцяжарвае, але і робіць немагчымым адасабленне іншаземнай чаканкі з узгадваемых пісьмовымі крыніцамі грашовых сум.

Характэрнай асаблівасцю манетнага фонду Беларусі была надзвычайная стракатасць рынкавых сродкаў плацяжу. Наступствам такой разнастайнасці манет, што знаходзіліся ў абарачэнні, стала адсутнасць стабільнасці курсаў іх абарачэння і неабходнасць выкарыстання ў штодзённасці лікавых паняццяў для таго, каб прывесці да агульнай асновы розныя рэальныя наміналы многіх краін.

У першай чвэрці XVIII ст. дакладна адсочваюцца тэндэнцыі да ўзмацнення эканамічных кантактаў паміж Расіяй і Усходняй Беларуссю, рынак якой увабраў не толькі значную колькасць расійскай манеты, але і некаторыя чыста расійскія лічыльна-грашовыя тэрміны. Усталёўваюцца даволі стабільныя суад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

носіны паміж літоўскімі, польскімі і заходнееўрапейскімі наміналамі, з аднаго боку, і расійскімі – з другога.

Найбольш поўную і глыбокую інфармацыю аб грашовай гаспадарцы ўсходнебеларускага рэгіёна захоўваюць прыбыткова-выдатковыя кнігі магілёўскага магістрата. Арыгінальныя магістрацкія кнігі, што дайшлі да нашага часу, знаходзяцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Мінску (ф. 1817).

Часткова фрагментаваны варыянт гэтай выбітнай крыніцы ўвайшоў у шматтомнае выданне – «Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хранящиеся в центральном Витебском архиве» (ГЮМ), якое было апублікавана ў 70-я гады XIX – пачатку XX ст.[1]

Параўнальны аналіз гэтых двух варыянтаў дае магчымасць адзначыць, што абсалютная большасць запісаў архіўнага варыянту засталася неапублікаванай і, такім чынам, выключанай з навуковага звароту. У той жа час абнародаваныя ў ГЮМе лічыльныя кнігі не з'яўляюцца «рэпрынтам» архіўных матэрыялаў, часам гэта няпоўныя і нават недакладныя іх копіі.

Тым не менш бясспрэчна вялікае значэнне гэтай дакументальнай серыі ў асвятленні эканамічнага і сацыяльнага жыцця не толькі Магілёва, але і Віцебска, Крычава, Мсціслаўля, Оршы, Полацка, Ушачаў і Чачэрска. Акрамя прыбыткова-выдатковых кніг і актавых матэрыялаў магілёўскага магістрата ў ГЮМ увайшлі дакументы віцебскага і полацкага магістратаў; дакументы крычаўскай і ўшацкай магдэбургій; акты віцебскага, полацкага, аршанскага, мсціслаўскага земскіх судоў; акты віцебскага, мсціслаўскага, полацкага гродскіх судоў; гродскія і земскія акты віцебскага ваяводства; земскія акты полацкага ваяводства; дакументы чачэрскага староства.

З 23-га выпуску ГЮМа (дакументы 1712 г.) архіўныя дакументы пачынаюць друкаваць у скарочаным варыянце. Сладальнік яго, архівіст і гісторык Міхаіл Лаўрэнцьевіч Вяроўкін, паведамляў, што лічыльная кніга за 1711 г. (22-і выпуск) – «последняя подробная (поўнасцю выдадзеная. – *І. К.*) приходо-расходная книга Могилевского магистрата. За последующие годы таковые книги представляют не более, как только перечни доходов и расходов г. Могилёва»[2]. Вывучэнне рукапіснага варыянту прыбыткова-выдатковай кнігі за 1712 г. і кніг наступных гадоў прыводзіць тым не менш да высновы, што яны не заслугоўваюць якіх-небудзь скарачэнняў. Так, кніга за 1712 г. побач са шматлікімі пералікамі прыбыткаў і выдаткаў горада ўтрымлівае даволі цікавыя і падрабязныя запісы, што датычаць грашовай гаспадаркі на тэрыторыі Усходняй Беларусі.

У 1877 г. першыя выпускі ГЮМа былі крытычна разгледжаны расійскім гісторыкам Міхаілам Флягонтавічам Уладзімірскім-Буданавым, які, даючы характарыстыку іх зместу і навуковай значнасці, пісаў: «...напечатана томов весьма немного; зато почти все напечатанные интересны в каком-либо отношении... большая половина всего издания занята приходно-расходными

[1] ИЮМ. Витебск, 1871–1906. Вып. 1–32.
[2] Тамсама. Витебск, 1891. Вып. 22. С. 35.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

книгами города Могилева, весьма важными для экономической истории страны… Видно, что издатели, не мудрствуя лукаво, руководствовались историческим чутьем, которое не обмануло их»[1].

Адзначаючы недахопы гэтага выдання, аўтар канстатуе, што «витебское издание актов вовсе не имеет плана: ни систематического, ни хронологического. Это, конечно, один из самых крупных его недостатков. Случай установил в нем следующий внешний порядок, выдержанный во всех шести томах: в первой половине тома помещаются приходо-расходные книги гор. Могилева; во второй акты, извлеченные из земских или магистратских книг». М. Уладзімірскі-Буданаў справядліва адзначае таксама не вельмі дакладны пераклад некаторых дакументаў на рускую мову.

Указваючы на вялікае значэнне ГЮМа як гістарычнай крыніцы, ён заключае: «Предоставленный нами обзор содержания «Историко-юридических материалов» далеко не исчерпывает, что есть в них ценного для нации. Он и сделан нами только для того, чтобы обратить внимание исследователей на это, к сожалению, весьма мало распространенное издание. Остается только желать, чтобы Витебские издатели не прекращали своего в высшей степени полезного труда»[2].

Магілёў, які атрымаў магдэбургскае права ў 1577 г., хутка стаў найбуйнейшым на тэрыторыі Беларусі гандлёва-прамысловым цэнтрам. Менавіта таму прыбыткова-выдатковыя кнігі яго магістрата, якія рупліва з года ў год вяліся на працягу некалькіх стагоддзяў і ў большасці ў дастаткова добрым стане дайшлі да нашых дзён, сведчаць аб гісторыі грашовай гаспадаркі не толькі самога горада, але і ўсёй Усходняй Беларусі.

Прыбыткова-выдатковыя кнігі магілёўскага магістрата насычаны звесткамі аб набыцці дзеля патрэб магістрацкіх служачых прадуктаў харчавання, а таксама аб аплаце разнастайных паслуг, неабходных для забеспячэння дзейнасці магістрацкай установы.

На працягу другой паловы XVII – XVIII ст. кошты тавараў і паслуг вызначаліся ў розных наміналах, што патрабуе звароту да курсаў абарачэння грашовых адзінак, вывучэння лікавых паняццяў і мясцовых адзінак вымярэння.

Інфармацыя аб коштах тавараў і паслуг на магілёўскім рынку прадстаўляе магчымасць напоўніць рэальным зместам тыя грашовыя адзінкі, што знаходзіліся ў абарачэнні на тэрыторыі Усходняй Беларусі ў другой палове XVII – XVIII ст.

Ваганні коштаў на тавары і паслугі звязаны з агульным працэсам інфляцыі, якая ўплывала на змены курсаў манетных наміналаў; аб'ёмам грашовай масы на руках у насельніцтва; якасцю саміх манет; суадносінамі паміж рынкавымі прапановамі і попытам з боку насельніцтва на асобныя віды тавараў; зразумела, мела значэнне мясцовае ці іншаземнае паходжанне тавару і інш.

---

[1] Владимирский-Буданов М. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилёвской. Витебск. 1871–1875 г. Т. I–IV // Оттиск из Киевских университетских известий. 1877. № 3. С. 4–5.

[2] Тамсама. С. 6.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Кошты на харчовыя, нехарчовыя тавары і паслугі ў другой палове XVII – XVIII ст. па матэрыялах прыбыткова-выдатковых кніг Магілёўскага магістрата (прыводзяцца мінімальныя і максімальныя ўзроўні[1])

*Харчовыя тавары*

| | | |
|---|---|---|
| Акуні | 10 штук | 1 злоты 2 грошы (1685) |
| Акуні | 1 капа | 2,5 злотых (1706) |
| Алей вяршковы | 1 фунт | 20 грошаў (1709) – 12 грошаў (1716) |
| Алей раслінны | 1 гарнец | 2 злотыя (1743) |
| Алівы | 1 фунт | 1 злоты (1688) – 24 грошы (1690) |
| Алівы | паўчвэрткі | 7 грошаў (1710) |
| Асяцёр | 1 фунт | 7 грошаў (1685) – 10 грошаў (1697) |
| Арэх мускатны | 1 штука | 6–8 грошаў (1714) |
| Асяцёр | 1 штука | 12 грошаў (1714) |
| Баран | | 2 злотыя (1684) – 2,5 злотых (1714) |
| Бораў | | 16 злотых (1714) |
| Буракі | 1 вядро | 8 грошаў (1719) |
| Віно | 1 гарнец | 6 злотых (1726) – 5,5 злотых (1736) |
| Віно | 1 кварта | 10,5 злотых (1714) – 1,5 злотых (1732) |
| Гарох | 1 фунт | 7,5 грошаў (1772) |
| Гарэлка | 1 гарнец | 2 грошы (1686) – 5 злотых 24 грошы (1716) |
| Гваздзіка | 1 лот | 12 грошаў (1685) – 3 злотыя (1758) |
| Гуркі | 1 капа | 27 грошаў (1714) |
| Гусь | | 1 злоты (1714) |
| Жыта | 1 мерка | 3 злотыя (1713) |
| Жыта | 1 асьміна | 40 злотых рускіх (1766) – 28 злотых рускіх (1768) |
| Імбір | 1 фунт | 15 грошаў (1682) – 2 злотыя 9 грошаў (1710) |
| Калач | | 1 грош (1712) |
| Карыца | 1 лот | 18–20 грошаў (1714) |
| Квят мушкатны | 1 лот | 24 грошы (1685) |
| Кілбаса | 1 колца | 3,5 гроша (1679) – 6 грошаў (1713) |
| Кмін | 1 фунт | паўталера (1692) – 18 грошаў (1714) |

[1] Складзена паводле: НГАБ. Ф. 1817. Магілёўскі магістрат; ИЮМ. Витебск, 1871–1898. Вып. 1–27; Скурат К. У. Даўнія беларускія меры. Мінск, 1976.

Колабава І. Н. Рынкавыя кошты ў Магілёве другой паловы XVII – 70-х гг. XVIII ст. // Мінулае і сучасная гісторыя Магілёва: зб. навук. прац III Міжнар. навук. канф. «Гісторыя Магілёва – мінулае і сучаснасць» / уклад І. А. Пушкін, В. В. Юдзін. Магілёў, 2003. Ч. I. С. 76–84.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | |
|---|---|---|
| Крупы: | | |
| аўсяныя | 1 кварта | 4 шэлегі (1679) – 3 грошы (1744) |
| грачаныя | 1 кварта | 9 грошаў (1712) – 1 грош 1 шэлег (1714) |
| рысавыя | 1 фунт | 20 грошаў (1713) – 26 грошаў (1714) |
| ячныя | 1 кварта | 1 грош (1713) – 2,6 гроша (1744) |
| Кураня | | 9–10 грошаў (1716) |
| Курыца | | 6 грошаў (1714) – 1 злоты 10 грошаў (1720) |
| Лешч | | 18 грошаў (1710) – 1 злоты 7,5 гроша (1711) |
| Мёд | 1 фунт | 1 злоты 2 грошы (1699) |
| Мёд | 1 гарнец | 1 злоты (1706) – 4 злотыя (1713) |
| Міндаль | 1 фунт | 20 грошаў (1685) – 3 злотыя (1719) |
| Мука | 1 гарнец | 12 грошаў (1710) |
| Мука | паўмеркі | 2 злотыя (1699) |
| Мяса | 1 шрот | 15 грошаў (1698) – 25,7 гроша (1699) |
| Мяса | 1 туша | 27 злотых (1710) |
| Мяса | 1 штука | 1 злоты (1720) |
| Парася | | 1 злоты (1713) |
| Пастэрнак | пучок | 12 грошаў (1719) |
| Перац | 1 фунт | 27 грошаў (1682) – 5 злотых (1714) |
| Піва | 1 гарнец | 10 шэлегаў (1683) – 10 грошаў (1722) |
| Пірог | | 1 грош (1683) – 2 грошы (1710) |
| Проса | 1 кварта | 1 чэх (1682) – 4 грошы (1710) |
| Пшаніца | 1 чацвярціна | 20–21 злоты (1717) |
| Пшаніца | 1 асьміна | 60 злотых рускіх (1766) |
| Пятрушка | пучок | 2 грошы (1719) |
| Разынкі | 1 фунт | 20 грошаў (1683) – 2 злотыя (1737) |
| Ракі | 1 капа | 25 грошаў (1686) |
| Рыж | 1 фунт | 12 грошаў (1685) – 1 злоты (1761) |
| Саланіна | 1 фунт | 5 грошаў (1685) – 10,5 гроша (1743) |
| Селядзец | 10 штук | 15 грошаў (1685) – 1 злоты (1697) |
| Селядзец | 1 штука | 3 грошы (1700) |
| Сліўкі | 1 фунт | 2 грошы (1722) |
| Солад | 1 мерка | паўталера (1689) |
| Соль | 1 фунт | 1 злоты 10 грошаў (1700) |
| Соль | 1 кварта | 10,5 грошы (1711) – 5 грошаў (1714) |
| Соль | 1 гарнец | 1 злоты 2 грошы (1710) – 1 злоты (1714) |
| Сыр | 1 штука | 5 грошаў (1684) – 8 грошаў (1685) |
| Фігі | 1 фунт | 1 злоты (1722) |
| Хлеб (сітны) | 1 булка | 18 грошаў (1697) – 2 грошы (1700) |
| Хлеб (чорны) | | 20 грошаў (1712) – 6 грошаў (1714) |
| Хлеб | 1 бохан | 1 злоты (1699) – 1,5 злотых (1700) |
| Хмель | 1 мерка | 7 грошаў (1685) |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | |
|---|---|---|
| Цукар | 1 фунт | 1 злоты (1685) – 4 злотыя (1706) |
| Цыбуля | 1 пляцёнка | 6 грошаў (1706) – 18 грошаў (1726) |
| Цыбуля | 1 штука | паўгроша (1697) |
| Цыбуля (насенне) | 1 фунт | 4 грошы (1679) |
| Цынамон | 1 лот | 1 злоты 15 грошаў (1713) – 15 грошаў (1737) |
| Цяля | | 6 злотых (1716) |
| Шафран | 1 лот | 20 грошаў (1712) – 5 злотых (1714) |
| Шчупак | | 12 грошаў (1710) – 15 грошаў (1714) |
| Яблыкі | 1 капа | 2 грошы (1706) – 1 злоты 2,5 гроша (1714) |
| Яйкі | 1 капа | 1 злоты (1697) – 1 злоты 20 грошаў (1698) |
| Яйкі | 10 штук | 12 грошаў (1711) – 1 грош (1719) |
| Яйкі бітыя | 10 штук | 4,5 гроша (1714) |
| Ялавічына | 1 чвэрць | 5,5–7,5 злотых (1714) |
| Ячань | 1 асьміна | 28 рускіх злотых (1766) |

*Нехарчовыя тавары*

| | | |
|---|---|---|
| Аброць | | 18 грошаў (1685) – 9 грошаў (1714) |
| Авёс | 1 мерка | 10 грошаў (1680) – 8 злотых (1711) |
| Бервяно | | 4,5 гроша (1679) – 1 грош (1681) |
| Боты | | 4 тымфы (1690) – 9 тымфаў (1761) |
| Бочка для захавання грошай | | 15 грошаў (1686) |
| Брус | | паўталера (1692) – чвэрць талера (1695) |
| Вазок санны | | 2 злотыя 4 грошы (1683) – 1 злоты 20 грошаў (1686) |
| Вілы | | 3,6 гроша (1698) |
| Вол | | 31,5 злотых (1686) |
| Волава | 1 фунт | 7 грошаў (1679) – 18 грошаў (1729) |
| Вядро | | 8 капеек (1777) |
| Гарнастай | 1 сарок | 7 талераў (1695) – 12 рублёў (1738) |
| Гарнастай | 1 штука | 4 злотыя (1709) |
| Гліна | 1 воз | 2,5 капейкі (1758) |
| Дзёгаць | 1 кварта | 3 грошы (1692) |
| Дровы | 1 воз | 1 злоты 22 грошы (1713) – 9 грошаў (1722) |
| Дровы: | | |
| альховыя | 1 воз | 9 капеек (1775) |
| сасновыя | 1 воз | 10 капеек (1719) |
| сечаныя | 1 воз | 18 грошаў (1706) – 20 грошаў (1724) |
| Жалеза | 1 фунт | 6 грошаў (1683) |
| Замок | | 12 грошаў (1685) |
| Казёл | | 3 злотыя 7,5 гроша (1750) |
| Каноплі | 1 асьміна | 16 злотых рускіх (1766) |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | |
|---|---|---|
| Кілім | | 22 злотых (1709) |
| Кітайка | 1 штука | 11 злотых (1714) |
| Конь | | 21 талер (1686) – 62,5 злотых (1734) |
| Конь стары | | 3 злотыя 8 грошаў (1685) |
| Крэмень для пісталета | | 4 грошы (1714) |
| Крыж срэбны | | 2 алтыны (1714) |
| Кубак срэбны | | 70 злотых (1663) |
| Ліхтар | | 3 грошы (1682) |
| Медзь | 1 пуд | 48 тымфаў (1715) |
| Мерка для жыта | | 4 грошы (1689) |
| Мыла | 1 фунт | 6 грошаў (1682) – 10 грошаў (1714) |
| Нагавіцы | | 10 алтынаў (714) |
| Нажніцы канцэлярскія | | 9 грошаў (1712) |
| Палатно пасконае | 1 локаць | 4 грошы (1685) |
| Палатно швабскае | | 15 талераў (1737) |
| Панчохі | | 5 алтынаў (1714) |
| Папера | 1 лібра | 15 грошаў (1685) – 1 злоты 6 грошаў (1720) |
| Парахаўніца | | 1 грыўня (1714) |
| Пісталет | | 32,5 злотых (1714) – 12,5 злотых (1717) |
| Порах | 1 фунт | 15 грошаў (1682) – 1 злоты 10 грошаў (1697) |
| Рукавіцы | | 27 грошаў (1681) – 3 злотыя 5 грошаў (1690) |
| Рукавіцы воўчыя | | 2 злотыя (1699) |
| Рыдлёўка | | 3 грошы (1695) – 1,5 гроша (1710) |
| Салома | 1 воз | 6 грошаў (1683) – 30 грошаў (1749) |
| Сані | | 1 злоты 15 грошаў (1685) – 2 злотыя 15 грошаў (1711) |
| Свечы | 10 штук | 4 грошы (1682) – 11 грошаў (1712) |
| Свінец | 1 фунт | 8 грошаў (1686) |
| Сена | 1 воз | 4 злотыя (1712) – 15 грошаў (1727) |
| Скура баранчыка | | 1 талер (1714) |
| Скура казліная | | 1 злоты 3 грошы – 7 злотых (1714) |
| Скура паўюхтавая | | 1 злоты 15 грошаў (1685) |
| Собаль | | 9 рублёў (1706) – 42,5 талера (1714) |
| Собаль з хвастом | | 200 злотых (1683) |
| Спадніца саматканая | | 3 злотыя (1752) |
| Стакан шкляны | | 3 грошы (1713) |
| Сукно | 1 локаць | 12 тымфаў (1716) – 6 тымфаў (1736) |
| Сякера | | 20 грошаў (1683) – 1 злоты (1714) |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | |
|---|---|---|
| Тачка | | 20 грошаў (1685) |
| Тканіна на жупаны | 1 локаць | 3 тымфы 5 грошаў (1692) |
| Труна простая | | 2 злотыя (1714) |
| Тытунь | 1 фунт | 10 грошаў (1685) |
| Тытунь | 1 папуша | 6 грошаў (1714) |
| Фляш шкляная | 10 штук | 4 злотыя (1714) |
| Цэгла | 100 штук | 1 злоты (1685) |
| Чобаты | | 2 злотыя 16 грошаў (1685) |
| Шабля | | 4 злотыя (1685) – 7 злотых (1695) |
| Шапка | | 2,5 злотых (1685) – 2 злотыя (1695) |
| Шапка сабаліная | | 133 злотыя 10 грошаў (1699) |
| Шуба вавёрчына | | 9 талераў (1714) |

*Паслугі*

| | |
|---|---|
| Агнянніку за пільнаванне агня ў тыдзень | паўкапы (1684) |
| Вазніцы за прывоз 1 воза гліны | 10 шэлегаў (1682) |
| Вазніцы за прывоз 1 воза цэглы | 1 чэх (1698) |
| Вайскоўцу за пісанне квіткоў | 2 злотыя 8 грошаў (1744) |
| Вартаўніку ратушнаму за тыдзень | 2 злотыя (1700) |
| Грабцу сена | 1 орт (1684) |
| Дворніку, назіраўшаму за рамеснікамі, за тыдзень | 1 капа (1698) |
| Дворніку, які званіў у брацтве на малебен | 1 злоты (1700) |
| Ігумену за малітву | 1 рубель (1738) |
| Клікуну за тыдзень | 1 злоты 3 грошы (1700) |
| Ксяндзу за малітву | 2 талеры (1680) – паўталера (1692) |
| Муляру за рамонт печкі | 1 злоты 7 грошаў (1700) |
| За атмыканне замка слесару | 6 грошаў (1700) |
| За акаванне кола кавалю | 4 злотыя (1700) |
| За варту вярблюда за тыдзень | 14 асмакоў (1711) |
| За выробленне скуры «ласіны» | 2 злотыя (1710) |
| За дастаўку ліста | 1 шостак (1713) |
| За два лісты па пошце | 1 злоты 6 грошаў (1700) |
| За направу сякеры, што ў турме | 8 грошаў (1692) |
| За ўвязванне рэестраў | паўталера (1692) |
| За пахаванне людзей убогіх двум работнікам у тыдзень | 2 злотыя (1710) |
| Землякопу за выкапаны роў | 6 патройных (1684) |
| Падкоўка каня | 1 злоты (1683) |
| Падкоўка каня (з коштам падкоў) | 1 злоты 18 грошаў (1713) |



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| Пільнаванне сена за 2 дні | 18 грошаў (1692) |
| Пісару за пісанне спраў | паўталера (1697) |
| Пісару за пісанне лістоў | 1 тымф (1744) – 2 тымфы (1745) |
| Рэзчыку дзёрну | 18 грошаў (1684) |
| Спевакам за канцэрт | 4 тымфы (1700) |
| Ураднiку за знаходжанне крадзенай жывёлы | 10 талераў (1711) |
| Хрышчэнне знайдыша | паўталера (1684) |

*Манетныя наміналы і грашова-лічыльныя паняцці*

| | |
|---|---|
| Алтын | намінал у 3 капейкі; грашова-лічыльнае паняцце (3 капейкі ці 9 грошаў) |
| Асмак | польскі грош |
| Грош | грашовы намінал; грашова-лічыльнае паняцце |
| Грыўня | грашова-лічыльнае паняцце (48 грошаў) |
| Злоты | лічыльнае паняцце (30 грошаў) |
| Злоты рускі* | лічыльнае паняцце (10 капеек ці 30 грошаў) |
| Капа | грашова-лічыльные паняцце (60 грошаў) |
| Капейка | 1/100 рубля, вартасны парытэт 3 грошам |
| Орт | грашовы намінал у 1/4–1/6 талера |
| Патройны | грашовы намінал у 3 грошы |
| Рубель | грашовы намінал; грашова-лічыльнае паняцце (100 капеек ці 300 грошаў) |
| Талер | грашовы намінал; грашова-лічыльнае паняцце (90–180 грошаў) |
| Тымф | грашовы намінал у 30 грошаў |
| Чэх (паўтарак) | грашовы намінал у 1 $^1/_2$ гроша |
| Шостак | грашовы намінал у 6 грошаў |
| Шэлег (солід) | грашовы намінал у 1/3–1/5 гроша |

*Метралагічныя адзінкі*

| | |
|---|---|
| Асьміна | 1/2 чвэрці (чацвярціны) |
| Вядро | 2 гарнцы вялікія – 4 гарнцы малыя – 11,295 л |
| Гарнец вялікі | 2 гарнцы малыя – 5,6474 л |

---

* У першай чвэрці XVIII ст. ва Усходняй Беларусі ўсталёўваецца стабільны курс абарачэння капейкі ў 3 польскія грошы, што, у сваю чаргу, азначала адпаведнасць 10 капеек 30 грошам ці 1 польскаму злотаму.

Цвёрды курс абарачэння капейкі ствараў умовы для ўзнікнення новага лічыльнага паняцця – «рускі злоты», якое аб'яднала традыцыйны тэрмін (злоты) і расійскую грашовую адзінку (капейка). Такім чынам, насельніцтва Усходняй Беларусі ўдала выкарыстоўвала ў штодзённых рынкавых аперацыях вельмі зручныя суадносіны, што склаліся паміж звыклым лічыльна-грашовым паняццем і расійскай манетай. Тэрмін «рускі злоты» сустракаецца, напрыклад, пры пераліку сум, выплачаных рэальнымі капейкамі на лічыльныя злотыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| Гарнец малы | 4 кварты – 2,8237 л |
| Кварта | 1/4 гарнца малога |
| Капа | 60 штук |
| Лібра | 25 аркушаў |
| Локаць | 0,6492 м |
| Лот | 11,71 г |
| Мерка | 7 кварт |
| Папуша | звязка тытунёвага лісця |
| Пуд | 16,3805 кг |
| Сарок | 40 штук |
| Фунт | 409,512 г |
| Чацвярціна | чвэрць |
| Чвэрць | 2 асьміны – 6–8 пудоў |
| Чвэрка | 1/2 гарнца |
| Шрот | кавалак |
| Штука палатна | 48 локцяў; іншых тканін – 30, 50, 60, 98 локцяў |

**Уладзімір Пашкевіч** *(Мінск)*

## ШЛЯХІ ЎХІЛЕННЯ АД ВЫПЛАТЫ МЫТА НА ТЭРЫТОРЫІ ВКЛ У ПАЧАТКУ XVIII ст. (ПАВОДЛЕ КНІГ МЕТРЫКІ ВКЛ)

Правядзенне гандлёвай дзейнасці ў часы Вялікага Княства Літоўскага адбывалася як у межах, якія ўстанаўліваў закон, так і з парушэннем норм заканадаўства. Адным з першых патрабаванняў закона была выплата мытных падаткаў, без чаго гандаль лічыўся незаконным, нелегальным, кантрабандным.

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца высвятленне парушэнняў мытнага заканадаўства на тэрыторыі ВКЛ у пачатку XVIII ст. Асноўнай крыніцай для правядзення даследавання з'яўляюцца дакументы кніг Метрыкі ВКЛ.

Да пачатку XVIII ст. у ВКЛ склалася адладжаная сістэма мытнай службы, якая абапіралася на шматлікія пункты мытнага надгляду, так званыя каморы і прыкаморкі, размешчаныя на асноўных гандлёвых шляхах. Каморы падзяляліся на сухапутныя і каморы воднага сплаву (на рэках). Паводле даных на 1703 г., у ВКЛ налічвалася 9 камор воднага сплаву, пяць з іх размяшчалася на тэрыторыі сучаснай Беларусі. У напрамку да порта Каралявец (Кёнігсберг, цяпер Калінінград) існавалі Віленская, Ковенская, Юрбаркская і Гарадзенская каморы воднага сплаву, на р. Буг знаходзілася Берасцейская камора, а ў напрамку да Рыжскага порта – Віцебская, Полацкая, Дзісненская і Дынабургская каморы[1].

Колькасць сухапутных камор і прыкаморкаў у разглядаемы перыяд была значна большай, яны густой сеткай пакрывалі тэрыторыю ВКЛ, але дакладную

[1] VL. T. 6. Petersburg, 1860. S. 60.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ